структура мовы, сістэма словаўтварэння, асновы лексікі былі трывала засвоены студэнтамі. Гэта дасягаецца пастаяннай увагай да марфалагічнага і сінтаксічнага аналізу тэкстаў, выкарыстання перакладаў не толькі з лацінскай, але і на лацінскую мову. З гэтай мэтай студэнтам прапаноўваецца гульня "Праўда ці хлусня". Студэнты пішуць на лацінскай мове 3 сказы пра сябе, складанасць сказаў залежыць ад аб'ёму пройдзенай граматыкі. Адзін з іх з'яўляецца праўдай, астатнія два – хлусня, напрыклад: 1) Timeo canes; 2) Habeo sorōrem minōrem; 3) In scholam male discēbam. Студэнты павінны вызначыць: які з трох варыянтаў з'яўляецца праўдзівым ("verum est").

Добра ўспрымаюцца студэнтамі і падкрэсліваюць актуальнасць вывучэння лацінскай мовы наступныя заданні: збіранне паўсюль лацінскіх надпісаў, інсцэніроўкі са старажытнарымскага жыцця, разважанне над партрэтамі людзей старажытнасці, запаўненне лацінскіх анкет і крыжаванак, рашэнне рэбусаў і антычных загадак, маляванне асацыятыўных ілюстрацый да пройдзенага матэрыялу, напісанне на лацінскай мове сачыненняў на звыклыя, стандартныя, але з нечаканым гучаннем і значэннем тэмы – "Patria mea" ("Мая радзіма"), "Homo est mundus omnis" ("Чалавек – гэта цэлы свет") і інш.

Звяртаем увагу на тое, што творчыя заданні і навучальныя гульні не павінны замяняць сабой традыцыйныя метады навучання, аднак яны здольныя стаць вельмі эфектыўным дадаткам да іх, выступіўшы ў якасці сродку інтэнсіфікацыі і гуманізацыі навучальнага працэсу.

**Літаратура**

1. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭн, 2004. – 448 с.

2. Прыстаўка, Я.У. Latina aeterna: зборнік тэкстаў і практыкаванняў па лацінскай мове / Я.У. Прыстаўка. – Масква : Букстрим, 2013. – 72 с.

3. Словарь латинских дериватов в языках восточных и западных славян / Г.И. Шевченко, А.В. Гарник, А.В. Кириченко; под ред. Г. И. Шевченко. – Минск : БГУ, 2007. – 109 с.

***А.П. Райчонак***
(настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА "Сярэдняя школа № 16 г. Полацка")

## ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ З КАМПАНЕНТАМ "ВОКА": СЕМАНТЫЧНЫ, ГРАМАТЫЧНЫ І СІНТАКСІЧНЫ АСПЕКТЫ

У беларускай мове нароўні з лексічным складам існуе і фразеалагічны, які налічвае каля 6000 устойлівых выразаў з непадзельным, цэласным сэнсам – фразеалагізмаў. Разам са словамі яны з'яўляюцца "будаўнічым матэрыялам" для сказаў [2, с. 3]. Фразеалагізмы, як і словы, называюць пэўныя паняцці, але адрозніваюцца тым, што ў абсалютнай большасці выступаюць як трапныя сродкі выказвання думак і пачуццяў.



Репозиторий ВГУ

Значэнне фразеалагізма не складаецца са значэнняў яго кампанентаў паасобку, а таму вялікую цікавасць выклікае даследаванне семантыкі фразеалагічных адзінак, якія аб'ядноўваюцца адным структурным кампанентам. На матэрыяле "Фразеалагічнага слоўніка" Н.В. Гаўрош, І.Я. Лепешава, Ф.М. Янкоўскага намі былі прааналізаваны фразеалагізмы з кампанетам "часткі цела", у прыватнасці – кампанентам "вока". Такіх адзінак у слоўніку сустракаецца 83.

Нягледзячы на тое, што асноўнае значэнне слова "вока" – 'адзін з органаў пачуццяў чалавека або жывёлы, які адказвае за здольнасць бачыць', значэнне фразеалагізмаў з гэтым кампанентам рознае: *лезці ў вочы* – 'назойліва прыставаць, дакучаць', *набіць вока* – 'набыць вопыт, уменне хутка вызначаць штосьці, ацэньваць', *на вока* – 'прыблізна', *пляваць у вочы* – 'рэзка, груба выказваць знявагу, пагарду, непашану да каго-небудзь', *стаяць у вачах* – 'засланяць, загароджваць святло, засціць', *вочы гараць* – 'пра таго, каму вельмі моцна нечага захацелася'.

Найбольш распаўсюджаным з'яўляецца ўжыванне назоўніка ў вінавальным склоне – 44 разы (*у вочы, паказацца на вочы, працерці вочы, вочы выбіраць, узяць на вока, на свае вочы*); творным – 13 разоў *( як вокам згледзець, мераць вокам, вокам не маргнуць, глядзець вачамі*); родным – 10 разоў (*у момант вока, вачэй не адводзіць, не спускаць з вока, знікнуць з вачэй*). Адзінкавым з'яўляецца ўжыванне кампанента ў давальным склоне (*вачам сваім не верыць*). Цікавасць выклікае фразеалагізм *з вока на вока*, у якім назоўнік ужыты двойчы ў розных склонавых формах.

Кампанент "вока" сустракаецца ў фразеалагізмах часцей за ўсё ў форме множнага ліку (*у вочы не бачыць, трапляцца на вочы, вачэй не спускаць, знікнуць з вачэй, падняць вочы*). Але сустракаецца і варыятыўнасць ліку: *кідаць вочы (вока), не спускаць з вока (вачэй), мераць вокам (вачамі), з вачэй (вока)*. Адзін раз сустракаецца ўжыванне памяншальна-ласкальнай формы слова – *страляць вочкамі*.

У большасці сваёй фразеалагізмы з кампанентам "вока" адназначныя, але з'ява полісеміі, уласцівая словам, сустракаецца і сярод іх. Напрыклад, *мець на воку* – 'улічваць штосьці', 'ставіць мэту, задумваць', 'не забывацца пра што-небудзь'; *як вокам згледзець* – 'вельмі хутка', 'як толькі можна (пра адлегласць, далечыню) убачыць'; *з вачэй* – 'далей ад каго-небудзь', 'прэч, вон адсюль'.

У галіне фразеалогіі даволі часта назіраецца такая з'ява, як варыянтнасць – здольнасць аднаго і таго ж фразеалагізма выступаць у дзвюх, а то і болей разнавіднасцях, узаемазамяняльных у любым кантэксце. Лексічная варыянтнасць мае месца ў наступных фразеалагізмах: *куды дзець вочы – дзе падзець вочы, вочы б не глядзелі – вочы б мае не глядзелі, вочы вырачыць – вочы вылупіць, вытрашчыць*. Марфалагічная прысутнічае ў такіх адзінках, як *кідаць вочы (вока), з завязанымі вачамі (-ыма), мераць вокам (вачамі*). Словаўтваральныя варыянты бачым у



Репозиторий ВГУ

наступных фразеалагізмах: *упасці ў вока – папасці ў вока, вочы гараць – вочы загарэліся, адным вокам – адным вочкам*.

Асобна можна выдзеліць сінанімічныя па значэнні фразеалагізмы. Фразеалагічныя сінонімы абазначаюць адно і тое ж паняцце, маюць тоеснае або блізкае значэнне, але звычайна адрозніваюцца адзін ад другога адценнямі значэння і стылістычнай афарбоўкай [2, с. 82].

Так, напрыклад, сустракаюцца наступныя сінанімічныя рады: *куды вочы глядзяць, у свет вочы* – са значэннем ‘ісці, не выбіраючы дарогі’; *вочы адвесці, замазваць вочы* – ‘падманваць’; *адным вокам, акінуць вокам, кідаць вочы* – ‘зірнуць, глянуць’; *вачэй не паказваць, знікнуць з вачэй, не паказвацца на вочы* – ‘не з’яўляцца, пазбягаць сустрэчы’, *вырасці ў вачах, упасці ў вока* – ‘спадабацца’; *вочы вылупіць, вочы на лоб лезуць* – ‘здзіўленне, напружанне’).

Сярод фразеалагізмаў з кампанентам “вока” прысутнічаюць і антанімічныя пары: *за вочы* – ‘пры адсутнасці каго-небудзь, завочна гаварыць, смяяцца’, *у вочы* – ‘у прысутнасці, адкрыта, у твар сказаць’; *вочы адвесці* – ‘адцягнуць чыюсьці ўвагу ад чаго-небудзь, схітраваць, падмануць’, *адкрыць вочы* – ‘дапамагчы зразумець сапраўднае становішча, зрабіць відавочнай сітуацыю’; *вачэй не паказваць* – ‘не з’яўляцца, не прыходзіць да каго-небудзь’, *вочы мазоліць* ‘дакучаць, дапякаць сваёй прысутнасцю’; *паказацца на вочы* – ‘з’явіцца, прыйсці’, *знікнуць з вачэй* – ‘перастаць быць бачным’.

Фразеалагізмы маюць не толькі канкрэтнае значэнне, але і граматычнае (прадметнасці, дзеяння, прыметы і г.д.). Паводле свайго граматычнага значэння большасць фразеалагізмаў суадносіцца з рознымі часцінамі мовы. Самым шматлікім семантыка-граматычным тыпам з’яўляюцца дзеяслоўныя фразеалагізмы, якія абазначаюць дзеянне і выражаюць яго ў катэгорыях трывання, часу, ладу, роду. Сярод разглядаемых адзінак можна выдзеліць наступныя: *не адарваць вачэй, кідацца ў вочы, акінуць вокам, не спускаць вачэй, працерці вочы, лезці ў вочы, мераць вокам, падняць вочы, закрыць вочы.* Таксама можна ўбачыць вялікую колькасць прыслоўных фразеалагізмаў: *з вока на вока, для адводу вачэй, на свае вочы, у вачах, адным вокам, заплюшчыўшы вочы, на вока, на свежае вока, у сабакі вачэй пазычыўшы, у момант вока, хоць вока выкалі*.

Што датычыцца назоўнікавых і прыметнікавых фразеалагізмаў з кампанентам “вока”, то яны ў слоўніку сустракаюцца толькі ў адзінкавых выпадках: *чортава вока* і *вока не запарушыць*.

Па сваёй будове фразеалагізмы падобныя на спалучэнні слоў, словазлучэнні і сказы. За кожным з іх замацавалася свая структура, якая з’яўляецца такой жа ўстойлівай, як і яго семантыка.

Самую вялікую колькасць з разгледжаных адзінак складаюць фразеалагізмы са структурай словазлучэння: *падняць вочы, вачэй не спускаць, узяць на вока, чортава вока, страляць вочкамі, паказацца на*



Репозиторий ВГУ

*вочы, вочы калоць, вырасці ў вачах, мець на воку, бяльмо на воку.* Са структурай сказа фразеалагічных адзінак знайшлося няшмат: *куды вочы глядзяць, куды дзець вочы, вочы гараць, вочы адкрыліся, вочы на лоб лезуць.* Фразеалагізмы са структурай спалучэння слоў адносяцца, як правіла, да прыслоўных і сустракаюцца значна часцей, чым выразы іншых семантыка-граматычных тыпаў. Сярод абраных адзінак можна выдзеліць наступныя: *за вочы, у вочы, на вока, на вачах, з вачэй.*

Такім чынам, фразеалагізмы з кампанентам "вока" маюць разнастайную, багатую семантыку. Нягледзячы на тое, што ў большасці выпадкаў яны адназначныя, з'ява полісеміі таксама сустракаецца сярод іх. Акрамя таго, назіраецца варыянтнасць фразеалагізмаў, яны могуць утвараць сінанімічныя і антанімічныя пары.

Паводле свайго граматычнага значэння большасць фразеалагізмаў суадносіцца з дзеясловамі і прыслоўямі, рэдка – з назоўнікамі і прыметнікамі. Паводле сінтаксічнай характарыстыкі фразеалагізмы адносяцца да фразеалагізмаў-словазлучэнняў і фразеалагізмаў-спалучэнняў слоў. Са структурай сказа акрэсленыя адзінкі сустракаюцца рэдка.

**Літаратура**

1. Гаўрош, Н.В. Фразеалагічны слоўнік / Н.В. Гаўрош, І.Я. Лепешаў, Ф.М. Янкоўскі; пад рэд. Ф.М. Янкоўскага. – Мінск: Нар. асвета, 1973.

2. Лепешаў, І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы: Вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Выш. шк., 1998.

***В.П. Русак***
(загадчык аддзела сучаснай беларускай мовы
Цэнтра даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі)

## ВЫДАТНЫ ГРАМАТЫСТ СТАГОДДЗЯ – БРАНІСЛАЎ ТАРАШКЕВІЧ

У сучасным мовазнаўстве практычна ні адно сістэмнае апісанне марфалагічных катэгорый і словаформ, спосабаў словаўтварэння і сінтаксічных канструкцый не абыходзіцца без звароту да ўзаемадзеяння лексічных, марфалагічных, сінтаксічных фактараў і, адпаведна, да ролі слова ў сістэме граматычных адносін. Але, каб сучасныя даследчыкі маглі мець такую магчымасць, найперш неабходна было з'явіцца мовазнаўцу, які б здолеў у моўным вадавароце стварыць крыніцу арганічнага жыцця слова. Для беларусазнаўства такой асобай стаў акадэмік Браніслаў Адамавіч Тарашкевіч.

Выхад у свет у 1918 г. яго кнігі "Беларуская граматыка для школ" прынята лічыць пачаткам унармавання сучаснай беларускай пісьмовай мовы [15]. Да яе з'яўлення беларуская літаратурная мова вызначалася значнай неўнармаванасцю, адсутнасцю адзіных прынцыпаў правапісу і



Репозиторий ВГУ